# З АСАБІСТАГА ДОСВЕДУ ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНАЙ ЭКСПЕРТЫЗЫ З РАСІЙСКІМІ ВУЧОНЫМІ (ПАЧАТАК 1990-х гг.)

**У. Е. Снапкоўскі**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, snap@bsu.by*

У артыкуле аналізуецца асабісты досвед удзелу аўтара ў знешнепалітычных дыскусіях з расійскімі навукоўцамі ў 1990—1991 гг. Асаблівасцю аўтарскай метадалогіі з'яўляецца ўзаемасувязь аналізу ўнутры- і знешнепалітычных падзей і працэсаў пачатку 1990-х гг. з асабістым досведам іх удзельніка, назіральніка і даследчыка. Разглядаюцца вынікі ўдзелу аўтара ў навуковых семінарах Інстытута Еўропы АН СССР, прысвечаных абмеркаванню актуальных пытанняў міжнародных адносін і знешняй палітыкі суверэнных дзяржаў. У цэнтры абмеркавання знаходзіліся ўзаемаадносіны паміж саюзнымі рэспублікамі і Цэнтрам, будучыня СССР як федэрацыі/канфедэрацыі і як адзінай ядзернай дзяржавы, адносіны саюзных рэспублік са знешнім светам. Па выніках знешнепалітычных дыскусій з расійскімі калегамі ў студзені 1992 г. накіравана аналітычная запіску міністру замежных спраў П. Краўчанку, змест якой раскрываецца ў артыкуле.

***Ключавыя словы:*** Беларуская ССР; Рэспубліка Беларусь; Савецкі Саюз; Расія; Украіна; незалежнасць; знешнепалітычная экспертыза.

# FROM PERSONAL EXPERIENCE OF FOREIGN POLICY EXPERTISE WITH RUSSIAN SCIENTISTS (EARLY 1990s)

**U. E. Snapkouski**

*Belarusian State University,*
*4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus, snap@bsu.by*

The article analyzes the author's personal experience of participation in foreign policy discussions with Russian scientists in 1990—1991. A feature of the author's methodology is the relationship between the analysis of domestic and foreign policy events and processes of the early 1990s with the personal experience of their participant, observer and researcher. The results of the author's participation in scientific seminars of the Institute of Europe of the USSR Academy of Sciences, devoted to the discussion of current issues of international relations and foreign policy of sovereign states, are considered. The discussion focused on the relationship between the Union republics and the Center, the future of the USSR as a federation/confederation and as a single nuclear state, and the relations of the Union republics with the outside world. Based on the results of foreign policy discussions with Russian colleagues, an analytical note was sent to the Minister of Foreign Affairs P. Kravchenko in January 1992, the contents of which are disclosed in the article.

***Keywords:*** Belarusian SSR; Republic of Belarus; Soviet Union; Russia; Ukraine; independence; foreign policy expertise.

У 1990—1991 гг. аўтар быў дактарантам Інстытута гісторыі АН БССР і працаваў у аддзеле гісторыі замежных сувязяў БССР над доктарскай дысертацыяй аб знешнепалітычнай дзейнасці Беларускай ССР у 1944—

1953 гг. У час аўтарскай дактарантуры СССР знаходзіўся у паласе глыбокай дэзінтэграцыі, якая завяршылася распадам краіны і выхадам на міжнародную арэну былых саюзных рэспублік. Беларуст разам з іншымі перажывала перыяд галоснасці і актывізацыі грамадска-палітычнага жыцця. Ва ўсіх рэспубліках гэта адбывалася па-рознаму. Пра гэта ў беларускай, постсавецкай і сусветнай літаратуры напісана вельмі шмат і з рознымі, супрацьлеглымі падыходамі, ацэнкамі і характарыстыкамі.

У Беларусі разгарнулася грамадска-палітычная і навуковая дыскусія па пытаннях знешнепалітычнай гісторыі Беларусі і яе ўдзелу ў міжнародных адносінах, асабліва ў XX ст. У цэнтры аказаліся праблемы межаў Беларусі, адносін беларускіх дзяржаў з суседзямі, палітыкі заходніх дзяржаў у дачыненні да Беларусі, сучаснага стану і перспектыў далейшага існавання Савецкага Саюза. Гэтыя тэмы і праблемы аўтарам апісаны па свежых слядах падзей у першай палове 1990-х гг. [1—3]. Пазней матэрыялы аб знешнепалітычнай дыскусіі ў Беларусі ўвайшлі ў выглядзе ў артыкулаў і аналітычных аглядаў прэсы ў курс лекцый аб знешняй палітыцы Рэспублікі Беларусь і зборнік навуковых артыкулаў аб беларуска-расійскіх адносінах [4; 5]. Яны з'яўляліся і працягваюць з'яўляцца важнай састаўной часткай выкладаемых на факультэце міжнародных адносін БДУ курсаў.

З пазіцый больш чым 30-гадовага вопыту развіцця Беларусі па шляху незалежнасці ўяўляецца важным і актуальным зварот да гістарычных падзей і працэсаў таго часу. Асаблівасцю аўтарскай метадалогіі з'яўляецца сувязь аналізу ўнутры- і знешнепалітычных падзей і працэсаў пачатку 1990-х гг. з асабістым вопытам іх удзельніка, назіральніка і даследчыка. У цэнтры нашай увагі будзе знешнепалітычная дыскусія ў Беларусі і СССР, асабліва ў Расіі і Украіне. У кантэксце саюзнага матэрыялу найбольш важнымі пытаннямі, якія абмяркоўваліся тады палітыкамі і вучонымі, з'яўляліся ўзаемаадносіны паміж саюзнымі рэспублікамі, крытычная пераацэнка ролі Цэнтра ў гісторыі савецкай федэратыўнай дзяржавы, будучыня СССР як федэрацыі/канфедэрацыі і як адзінай ядзернай дзяржавы, адносіны саюзных рэспублік са знешнім светам, новая знешняя і ваенная палітыка рэспублік. Так ці інакш на першае месца ў палітычным і навуковым дыскурсе выходзіў комплекс складаных і супярэчлівых расійска-ўкраінскіх адносін.

У другой палове 1991 г. аўтар удзельнічаў у трох навукова-грамадска-палітычных семінарах у Маскве, прысвечаных абмеркаванню актуальных пытанняў міжнародных адносін і знешняй палітыкі суверэнных дзяржаў. Два семінары былі арганізаваны Інстытутам Еўропы АН СССР (у ліпені і снежні), трэці — міжнароднай грамадскай арганізацыяй «Хельсінкская грамадзянская асамблея» (13—14 жніўня). Характэрна, што гэтыя мерапрыемствы праходзілі напярэдадні гістарычных падзей (жнівеньскага путчу і белавежскіх пагадненняў). Па іх выніках у студзені 1992 г. аўтар накіраваў запіску міністру замежных спраў П. Краўчанку на беларускай мове, палічыўшы важным і неабходным паведаміць знешнепалітычнаму

ведамству свае думкі і меркаванні аб выніках семінараў у Маскве і выказаць свае прапановы. Яна захавалася ў асабістым архіве і яе асноўны змест тут пераказваецца і каментуецца [6].

Чым былі цікавыя гэтыя семінары? Пастаноўкай пытанняў, якія раней не абмяркоўваліся, складам удзельнікаў, вынікамі абмеркавання. У семінарах, арганізаваных Інстытутам Еўропы, прынялі ўдзел гісторыкі і палітолагі з Расіі, Украіны, Беларусі, Латвіі, Эстоніі. Абмяркоўваліся пытанні нацыянальнай бяспекі суверэнных дзяржаў ва ўмовах распаду Савецкага Саюза, магчымыя шляхі і спосабы каардынацыі знешнепалітычнай дзейнасці былых суб'ектаў СССР. Менавіта так гучалі пытанні, пастаўленыя ў парадак дня. На семінарах аўтар быў адзіным прадстаўніком Беларусі (у якасці старшага навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі АН БССР, кандыдата гістарычных навук) і выступаў па пастаўленых на абмеркаванне пытаннях нацыянальных інтарэсаў і нацыянальнай бяспекі Беларусі ва ўмовах распаду СССР, знешнепалітычных аспектах суверэнітэту рэспублікі.

Дэлегацыя ад Украіны на семінарах у Інстытуце Еўропы была даволі шматлікай (3—5 чалавек) і асноўным прадметам абмеркавання і спрэчным пытаннем з'явілася праблема будучыні Украіны і расійска-ўкраінскіх адносін. Украінскія калегі выступалі з пазіцый хуткай і рэальнай незалежнасці Украіны і спрыяльных перспектыў яе развіцця з улікам высокага статусу рэспублікі ў складзе СССР, яе геапалітычных і геастратэгічных магчымасцяў у Еўропе і на міжнароднай арэне.

Маючы на ўвазе размяшчэнне на яе тэрыторыі вялікага патэнцыялу ядзернай зброі, што рабіла Украіну трэцяй ядзернай дзяржавай пасля ЗША і Расіі, яны лічылі, што іх краіна павінна захаваць яго на сваёй тэрыторыі і праводзіць палітыку ядзернага стрымлівання па ўсіх азімутах, узяўшы за ўзор Францыю («стратэгія абароны па ўсіх азімутах», распрацаваная пры прэзідэнце Ш. дэ Голе). Расійскія навукоўцы, прадстаўленыя не толькі Інстытутам Еўропы, але і іншымі акадэмічнымі інстытутамі і цэнтрамі (Інстытутам ЗША і Канады, ІМЭМО), звярталі ўвагу на ўразлівыя месцы Украіны (пярэсты этнічны склад, тэндэнцыі да федэралізацыі). Крым неяк асабліва не закранаўся, але праблема Усходняй Украіны была пастаўлена і актыўна абмяркоўвалася.

Намеснік дырэктара ІЕ АН СССР С. А. Караганаў, арганізатар семінараў і вядучы дыскутант з расійскага боку, заяўляў, што незалежная Украіна не пераварыць Данбас, які застанецца для яе чужародным целам. З-за праблем з рускамоўным насельніцтвам паміж Украінай і новай Расіяй можа ўзнікнуць узброены канфлікт. Гэты запіс застаўся ў маіх нататках. Доўгія гады ён выклікаў адчуванні нейкага фантастычнага апакаліпсісу, наколькі сама думка аб вайне паміж рускімі і ўкраінцамі ўяўлялася жахлівай і неверагоднай. Сёння, праз 30 гадоў, С. А. Караганаў, калі пачалася расейская «спецыяльная ваенная аперацыя» ва Украіне, піша, што шчыра шкадуе аб тым, што яго прароцтва спраўдзіліся. У чэрвені 2023 г. ён сказаў: «Я считаю, что такого рода конфликт — это

провал моего поколения, потому что мы могли не опустить открытой войны в Европе, которая, возможно, находится только в начальной фазе. Нужно было действовать раньше и решительнее» [7].

У запісцы міністру прапаноўваліся для абдумвання і магчымай рэалізацыі некалькі ідэй. Першая заключалася ў тым, што абвешчанаму прынцыпу нейтралітэту супярэчыць знаходжанне на тэрыторыі Беларусі ядзернай зброі, а сам прынцып стварае пэўны вакуум бяспекі Беларусі, абмяжоўваючы яе знешнепалітычную прастору. Таму «беларускай дыпламатыі не трэба актыўна прапагандаваць на міжнароднай арэне прынцып нейтралітэта Беларусі» [6, с. 2].

Другая прапанова была прама навеяна вынікамі абмеркавання ядзернага фактара на семінарах і заяўленымі тады пазіцыямі вучоных Расіі, Украіны і Казахстана. Адзначалася, што ні адна з ядзерных дзяржаў акрамя Украіны і Беларусі (пазіцыя Казахстана заставалася невыразнай) не ставіць пытання аб яго добраахвотным і аднабаковым знішчэнні. Зыходзячы з гэтага, а таксама з-за непрадказальнага развіцця падзей у Расіі і яе адносін з Украінай, нацыянальным інтарэсам Беларусі не адпавядала б хуткая і аднабаковая страта ядзернага статусу. Указвалася, што абвастрэнне адносін паміж Расіяй і Украінай з-за Чарнаморскага флоту не выключае таго, што Кіеў можа змяніць свае намеры ў адносінах да ядзернай зброі на тэрыторыі Украіны. Аўтарская выснова па гэтым пытанні была наступнай: «Беларусі не трэба спяшацца развітвацца з ядзернай зброяй, размешчанай на яе тэрыторыі. Відавочна, што першачарговае прызнанне ЗША Беларусі ў шэрагу іншых ядзерных дзяржаў былога Саюза, выклікана перш за ўсе яе ядзерным статусам. Хуткае знішчэнне ці вывад МБР і тактычнай ядзернай зброі прывядуць да натуральнага змяншэння інтарэсаў ЗША, як і Захаду ў цэлым, да Беларусі. Яе рэальны аўтарытэт будзе страчвацца па меры скарачэння атамнага патэнцыяла. Калі яго зусім не стане, Беларусь можа заняць вельмі сціплае месца ў знешнепалітычных прыярытэтах ЗША і Еўропы» [6, с. 3].

Трэцяя прапанова тычылася неабходнасці для Беларусі больш актыўна выкарыстоўваць сваё геапалітычнае становішча, улічваючы напружаныя расійска-ўкраінскія адносіны, для выканання місіі міратворца і прымірыцеля суседніх славянскіх рэспублік. Паколькі гэтыя адносіны нясуць у сабе вялікі патэнцыял канфліктаў і пагроз, то ў канфліктных сітуацыях Украіна (у большай ступені) і Расея (у меншай ступені) будуць лічыць Беларусь сваім прыхільнікам ці нават суддзёй. «Гэта будзе весці да павышэння ролі Беларусі ў знешнепалітычных прыярытэтах Масквы і Кіева. З боку беларускай дыпламатыі было б добра дыстанцыравацца ад расійска-ўкраінскіх супярэчнасцей і спрэчак і захоўваць па магчымасці найлепшыя адносіны з гэтымі славянскімі дзяржавамі, не ахвяруючы пры тым беларускімі інтарэсамі. Тым самым Беларусь зможа апраўдаць свае прызначэнне як маста паміж Усходам і Захадам» [6, с. 4].

Яшчэ адна прапанова тычылася праблемы нацыянальных меншасцей на тэрыторыі былога СССР, якая «ўяўляе сабой найвялікшую

ваенна-стратэгічную пагрозу Садружнасці Незалежных Дзяржаў і крыніцу цяперашніх і будучых ваенных канфліктаў». З пункту гледжання міжнародных адносін Беларусь сёння з’яўляецца краінай нацыянальнай стабільнасці, дзе няма ніякіх парушэнняў правоў меншасцей. Аналагічнага стаўлення да сваіх суайчыннікаў кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь магло чакаць і ад іншых дзяржаў, дзе жывуць беларусы. У сувязі з гэтым прапаноўвалася, не схаваю, у даволі катэгарычнай форме, але апраўданая тагачаснымі палітычнымі рэаліямі і маім даследчым досведам вывучэння беларускай дыяспары фармулёўка: «Беларуская дыпламатыя, дзяржаўныя і ўрадавыя органы Беларусі павінны лічыць адным са знешнепалітычных прыярытэтаў абарону правоў і інтарэсаў беларусаў за межамі Бацькаўшчыны» [6, с. 5].

У заключэнні прапаноўвалася стварыць групу экспертаў пры МЗС па знешнепалітычных праблемах, адной з мэт якой была б распрацоўка канцэпцыі знешняй палітыкі. З улікам відавочнага дэфіцыту прафесійных даследчыкаў міжнароднай дзейнасці Беларусі аўтар прапаноўваў і ўласныя паслугі ў справе правядзення «незалежнай беларускай знешняй палітыцы і дыпламатыі» [6, с. 6]. Пры ўважлівым чытанні свайго матэрыялу азтару падалося, што некаторыя думкі і прапановы, выказаныя 32 гады таму, захавалі сваё значэнне, асабліва датычныя ядзернай зброі, нейтралітэту, расійска-ўкраінскага канфлікту і ролі Беларусі ў яе ўрэгуляванні.

Навуковае супрацоўніцтва з расійскімі калегамі інстытуцыяналізавалася працай па сумяшчальніцтве на пасадзе вядучага навуковага супрацоўніка ў Інстытуце Еўропы РАН, што лічыў вялікім гонарам для сябе і выдатнай інтэлектуальнай школай. Урокі палітычнага рэалізму і адстойвання нацыянальных інтарэсаў, пададзеныя С. А. Караганавым, адыгралі прыкметную ролю ў фарміраванні аўтара як знешнепалітычнага даследчыка. Цягам некалькіх гадоў аўтар рыхтаваў для Інстыттута Еўропы РАН аналітычныя матэрыялы па праблемах унутранай і знешняй палітыкі Беларусі, беларуска-расійскіх адносін. Тады і пазней, як адзначалася, яны знайшлі адлюстраванне ў артыкулах і кніжных публікацыях. Што тычыцца першага досведу знешнепалітычнага аналізу, то ён быў вельмі карысны не толькі для ініцыятара запіскі ў беларускі МЗС, але, мяркуем і для гэтага ведамства, паколькі ў шэрагу выступаў П. Краўчанкі ў 1992—1993 і наступных гадах міністр неаднаразова звяртаўся да тэмы ядзернай зброі і немагчымасці, небяспекі яго захавання і захоўванні на тэрыторыі краіны. У той час гэта была кансалідаваная пазіцыя палітычнага і вайсковага кіраўніцтва Беларусі.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

1. Снапкоўскі, У. З Захадам ці Усходам / У. Снапкоўскі // Маладосць. — 1993. — № 1. — С. 249—252.

2. Снапкоўскі, У. «Дом» без падмурку / У. Снапкоўскі // Беларус. думка. — 1993. — № 1. — С. 17—20.

3. Снапкоўскі, У. Захаванне нейтралітэту застаецца нялёгкай задачай для Беларусі / У. Снапкоўскі // Беларусь. — 1994. — № 4. — С. 22—23.
4. Снапкоўскі, У. Е. Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь: курс лекцый / У. Е. Снапкоўскі. — Мінск: БДУ, 2007. — 183 с.
5. Снапкоўскі, У. Е. Беларуска-расійскія адносіны: зб. навук. артыкулаў / У. Е. Снапкоўскі. — Мінск: БДУ, 2009. — 139 с.
6. Снапкоўскі, У. Е. Міністру замежных спраў Рэспублікі Беларусь П. К. Краўчанку: запіска аб удзеле ў міжнародных навукова-грамадска-палітычных семінарах, прысвечаных знешнепалітычнай дзейнасці суверэнных дзяржаў. Мінск, 27 студз. 1992 г. // Асабісты архіў У. Е. Снакоўскага. 6 с.
7. «Мы сбрасываем западное иго...»: интервью С. А. Караганова // Россия в глобальной политике. — 07.06.2023. — URL: https://globalaffairs.ru/articles/my-sbrasyvaem-zapadnoe-igo/ (дата обращения: 15.09.2024).